Аўтар: Рэдакцыя
28.06.2020 00:00

Будслаўскі фэст ***Курыя Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі паведаміла, як пройдзе адпустовая ўрачыстасць у Нацыянальным санктуарыі Маці Божай у Будславе.*** Запланаваны на 3–4 ліпеня традыцыйны фэст пераносіцца на пазнейшы час. Інфармацыя пра магчымасць яго правядзення будзе пададзена пазней.

1–2 ліпеня ў мясцовым касцёле адбудуцца парафіяльныя адпустовыя ўрачыстасці.

Праграма

1 ліпеня – 18.00;
2 ліпеня – 9.00,
12.00, 18.00.

Усе св. Імшы пройдуць на адкрытым паветры. Праход у прэзбітэрый і ў стары касцёл будзе закрыты для вернікаў. Для ўшанавання абраза Маці Божай прапануецца ўвайсці ў базіліку праз цэнтральны ўваход, па цэнтральнай наве падысці да прэзбітэрыя і выйсці праз левую наву.

Хто збіраецца ўдзельнічаць ва ўрачыстасцях, просьба памятаць аб неабходнасці захавання сацыяльнай дыстанцыі і выкарыстання ахоўных масак. †

Тракелі 2020 ***Курыя Гродзенскай дыяцэзіі прадставіла інфармацыю адносна адпустовых ўрачыстасцей у дыяцэзіяльным санктуарыі Маці Божай Каралевы Нашых Сем'яў у Тракелях.*** Штогадовы фэст, які адбываецца па традыцыі ў ліпені, перанесены на пазнейшы час. Ён пройдзе, калі толькі дазволяць абставіны.

2 ліпеня ў мясцовым касцёле адбудзецца парафіяльная адпустовая ўрачыстасць.

Праграма

10.00 – св. Імша на палявым алтары;
13.00 – св. Імша на палявым алтары, якую ўзначаліць біскуп Гродзенскі Аляксандр Кашкевіч;
19.00 – св. Імша на палявым алтары;
21.00 – Марыйны заклік (просьба ўзяць з сабой свечкі).

Усе жадаючыя могуць прыняць удзел у адпустовай урачыстасці ў гонар Маці Божай Тракельскай. Кусташ санктуарыя кс. доктар Юрый Бяганскі ў гэты няпросты час запрашае таксама дыяцэзіян у індывідуальным парадку наведаць святыню, каб мець магчымасць памаліцца ля цудатворнага абраза.